20 год Гродзенскай дыяцэзіі (32)

Аўтар: Рэдакцыя
07.09.2012 01:00



2008 год

6 верасня - Юбілей 25-годдзя святарства а. Андрэя Шчупала CSsR. Урачыстую св. Імшу ў Новай Рудзе ўзначаліў кс. бп Аляксандр Кашкевіч.

13 верасня - Урачыстую св. Імшу з нагоды 100-годдзя побыту і дзейнасці Кангрэгацыі Сясцёр Найсвяцейшай Сям'і з Назарэта ўзначаліў у пабрыгіцкім касцёле кс. абп Тадэвуш Кандрусевіч.

27 верасня - У парафіі Адамавічы падчас св. Імшы пад кіраўніцтвам пастыра Гродзенскай дыяцэзіі на рукі правінцыяльнай сястры Кангрэгацыі Сясцёр Кармелітак, с. Феліксы, с. Вера Кучук склала вечныя шлюбы. † 4 кастрычніка - У санктуарый у Тракелях прыбыла II Нацыянальная пілігрымка сем'яў.

15 кастрычніка - У Шчучыне святкаваліся дзве ўрачыстасці: адпуст у дзень заступніцы парафіі, св. Тэрэзы Авільскай, і 180-годдзе пабудовы касцёла. Урачыстую св. Імшу ўзначаліў кс. бп Аляксандр Кашкевіч.

25 кастрычніка - У Вішневе (дэканат Смаргонь) ушанавалі 100-ю гадавіну Дня нараджэння Юзафа Кісяля, пробашча парафіі 1940–2002 гадоў.

2 лістапада - На старонках газеты "Слова Жыцця" пачала выходзіць газета Гродзенскай духоўнай семінарыі "Duc In Altum".

16 лістапада - У катэдральнай базіліцы кс. бп Аляксандр Кашкевіч удзяліў пасвячэнні прэзбітэрату двум дыяканам: Віктару Гваздоўскаму і Віталію Внароўскаму.

26 лістапада - У парафію Квасоўка былі перададзены рэліквіі бл. Цэліны Бажэнцкай. Урачыстую св. Імшу ўзначаліў пастыр дыяцэзіі.

30 лістапада - У гродзенскай катэдры адбыўся I Дыяцэзіяльны дзень супольнасці Эўхарыстычнага руху моладзі.